Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакції і адміністрації: Вільня, Віленская вул., № 29.
Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.
Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнції, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей„ хто нэ захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ве дама рэдакції. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 21 Жніуня 1914 г. № 33

**Прыймаецца далей падпіска на „Нашу Ніву“ на 1914 г.**
Цэна на год—2 р. 50 кап., на 6 мес.—1 р. 25 к., на 3 мес.—65 к., на 1 мес.—25 кап.
*Адрэс: Вільня, Віленская 29.*

## У добры час.

На вайне—у змаганьні з ворагам—людзі ў вадзін мамэнт аддаюць сваё жыцьцё. Кулі і бомбы, бытцым вострые сярпы, косяць сотні і тысячы душ, збіраючы багатае жніво сьмерці.

Але ёсць у нас вораг, страшнейшы за кулі і бомбы. Не адразу, не ў вадзін мамэнт, а памалу—з дня ды на дзень—па капельцы забірае ён нашае жыцьцё, нашые сілы, нашую долю і шчасьце. Гэта--п‘янства ўсенароднае.

Даўно змагаюцца з ім усе лепшые людзі нашае старонкі Але п‘янства не счэзае: яго сіла ў тым, што бадай ніхто ня верыць у пагібель яго.

Цяперашняя вайна, бяручы ад народу крывавую ахвяру, дала яму за гэта заплату: яна забіла п‘янства, паказаўшы, што яго можна звясьці.

У часі мобілізації выйшоў прыказ закрыць усе манапольки, ўсе шынкі і піўные. Гарэлкі ня стала. І вось людзі зразу кінулі піць: німа чым упівацца.

Ужо месяц прайшоў с таго часу. Месяц жыве цьвяроза наш народ І зусюль—з усяе дзержавы Расейскай—ідуць радасные весткі: маткі, жонкі і дзеці ня могуць нацешыцца, што для іх настаў—тыкі шчасьлівы час, што яны сыты, абуты і адзеты, што ў хаці лад і спакой. Усе цешацца, бо пераканаліся, што народ можэ абыходзіцца без гарэлкі.

Мобілізація ўжо скончылася; хадзіць чуткі сталі, што маняцца ізноў атчыніць манапольки. Але народ ужо сам ня хочэ гарэлкі: селяне па валасьцёх, рабочые на фабрыках пішуць прыгаворы, просячы, каб гарэлкі не прадавалі праз увесь час вайны.

Гэткіе прыгаворы шлюць і нашы беларусы,—шлюць у Вільню, ў Мінск і др. Народ схамянуўся, глянуў цьвярозымі вачыма павакол сябе і сам устаў на змаганьне с сваім страшэнным ворагам—п‘янствам.

Да канца вайны ішчэ далёка. Але ужо відаць, што вораг згіне: вера ў яго моц развеялася, як дым,—на гэтай веры дзержалася ўласць яго.

Народ ступіў на справядлівую дарогу. У добры час!

*а—н—а.*

## Цяперашніе патрэбы.

Калі дзе колечы з‘яўляецца агульная беда, тады людзі, быўшые раней адмежэваны адны ад другіх кожны, сваімі ўласнымі справамі, якбы інстыктыўна пачынаюць зьліжацца, і паміж іх вырастаець звязь шчырасьці і дружбы. Ды яно інакш і быць ня можэ. Падмога адзін аднаму у гэтакім часе служыць атпорам таму агульнаму нешчасьцю, каторое нарушаець нормальнае жыцьцё краю.

Гэтае самае бачым мы цяперака у нас у апошніх неспакойных часах вайны:

Ужо, апрача тых, каторые пашлі ваеваць, усе і адусюль людзі прыходзяць с сваей часткай помачы ці то грашамі ці то працай к другім болей бедным, болей асірацеўшым.

На вёсках цяпер на першай чародзі гэта—падмога у палевых работах. Трэба зьбіраць с поля, трэба жыта сеіць, трэба малаціць, а тут мейсцамі асталіся адны толькі кабеты ды дзеці—бяз мужчын, бяз упражы.

З гэтай прычыны ўжо у некаторых мейсцах па вёсках (у Арэнсбурзе, каля Рыгі у Лотышоў) ладзюцца гаспадарскіе атрады — гурткі, якіе дармо памагаюць у працы тым семьям, дзе гаспадары іх пашлі на вайну. Дык вось тым болей у нас, на Беларусі, дзе вайна мацней як у іншых мейсцах дае сябе знаць, трэба ладзіць нешта падобнае гэтакім атрадам—гурткам. Трэба розные работы талакамі рабіць, коні пазычаць тым, дзе іх не хапае, або і саўсім німа. Хай маладые дзяцюкі папрацуюць троху у тых семьях, дзе німа каму цяперака працаваць.

Памятайця тое, што цяперака шмат лягчэй вырataваць з бяды родных братоў сваіх шчырым стараньнем на іх ніве, чым тады, калі вы гэта прапусьціця, і у іх змарнуецца усё на полі, а вам прыдзецца гатовым сваім хлебам з імі дзяліцца.

Гэтакім парадкам зробіцца вялікая работа, якая шмат аблягчыць у нашым краю цяжкіе варункі жыцьця, выкліканые вайной. Вялікае падзякуй скажуць вам, працоўнікам на гэтым грунце, вашы браты, каторые кроў сваю праліваюць на вайне.

Еднайцеся браты па вёсках, ды аблягчайце колькі вашай магчымасці агульнае нашэ горэ.

Гэткая падмога цяпер у нас болей чым патрэбна, спадзеваемся нават, што ўжо на гэткі лад і робіцца штосьці, бо у такіх мінутах ахвяровываецца ʻусім за сьвяты доўг кожнаго чэлавека—памагчы адзін аднаму у бядзе...

# ВАЙНА.

### Расейска-Нямецкая.

13 жніўня. Расейскае войска наступае далей у глыб усходней Прусіі. забраны гарады: Нордэнбург, Бішоўсбург, Зэнсбург і станція Ротфліс (гэта апошняя ў Галіччыне). Немцы атступаюць к Кэніксбэргу і Алленштэйну.

14 жніўня. Наша войска зьліжаецца к крэпасьці Кэніксбэрг (Каралевец), атпіхаючы пярэдніе часьці гарнізона (крэпаснога войска). Узялі горад Тыльзіт. У Тыльзіце забрана шмат ваеннай дабычы і цэлы гарнізон. Жыхары уцяклі.

На усходне-пруским фронце 12, 13 і 14 жніўня адбывалася упорная бітва у раёне Сольдау, Алленштэйна і Бішофсбурга, куды вораг сабраў корпусы, што атступілі ад Гумбінэна, і свае сьвежые сілы. Расейцы узялі Алленштэйн. У раёне Петрокова наша конніца разбіла тры нямецкіе эскадроны і ўзяла ў палон 127 самакатнікоў.

17 жніўня. На прускім фронце у раёне Остэродэ паявіліся новые непрыяцельскіе сілы, якіе у некаторых мейсцах пераходзяць у наступленьне на нашых.

18 жніўня. С прычыны нагрмаджанай падмогі, сцягнутай з усяго фронту, дзякуючы шырока развітым жалезным дарогам, адборные сілы немцаў абрушыліся на нашы сілы—каля двух корпусоў, папаўшые пад самы сільны абстрэл цяжкай артылерыі, ад каторай мы панясьлі вялікіе страты. Войска білася храбра. Генералы Самсонов, Мартос, Пестіч і некаторые чыны штабу пагінулі.

### Расейска-Аўстрыяцкая.

12 жніўня. Расейскае войска у Галіччыне энэргічна наступае к Львову (сталіца Галіччыны), ад якога знаходзіцца ужо недалёка.

13 жніўня. Аддзельные бoі на Галіцкім фронце прынялі размер генеральнай бітвы, расшырыўшэйся у паўднённых паветах Люблінскай і Холмскай губэрніі і ўсходней Галіччыны на дарогах к Львову і прасьцягам на агульным фронце да 300 вёрст. Расейцамі здабыта адно знамя і праве саўсім зністожэны адзінаццаты поўк гонвэдаў.

15 жніўня. Бітва па аўстрыяцкім фронце ідзе далей з вялікім упорствам. На ўсход ад Львова узята у палон 3000 душ. Каля Падгайцаў страты праціўніка 3000. Намі узята з бою 4 гарматы і шмат яшчыкаў з набоямі і падабраны на пераправе цераз Залатую Ліпу пакінутые непрыяцелем 9 гармат і 60 яшчыкаў з набоямі. У ваколіцы на поўнач ад Томашова намі узята 1000 у палон, а к усходу ад Томашова—пятнаццатая вэнгерская дывізія разбіта і акружэна. Аддаюцца цэлые паўкі. На другіх участках вельмі упорные бітвы прадаўжаюцца. Глаўные сілы і змаганьне непрыяцеля распасьцераюцца у напрамках к Любліну, гдзе адбываюцца вельмі зацятые бітвы.

16 жніўня. Бітва на ўсім аўстрыяцкім фронце адбываецца. На паўдня ад Любліна расейскае войска перайшло агулам ад абароны к наступленьню і цяперака пасоваецца у раёне, заваленым крушнямі забітых аўстрыякоў, прыбраць каторых непрыяцель ня ўсьпеў. Нягледзючы на тое, што некаторые паўкі бьюцца ужо сёмы дзень, усёж такі бітвы адбываюцца вельмі заўзятые. Шмат удараў штыкамі. Каля Тамашова заядлы бой прадаўжаецца. На ўсім гэтым фронце расейцы узялі шмат людзей у палон, гарматы, пулемёты і яшчыкі з набоямі Здабыта ізноў аўстрыяцкае знамя.

### Сэрбска-Аўстрыяцкая.

Посьле разбіцьця сэрбамі аўстрыякоў, у Сэрбіі трохі прыцішэла, толькі час ад часу аўстрыяцкіе гарматы абстрэліваюць Белград, каторы усё ешчэ трымаецца і маўчыць на непрыяцельскую стрэляніну.

У часе атступлення аўстрыякоў, імі разрушэны і разграблены сэрбскі горад Шабац. Кажуць што пры гэтым аўстрыякі забівалі жыхароў—старцоў, дзяцей і кабет.

У часе васьмідзённых бітвоў на фронце Шабац-Дрына аўстрыякі панеслі страты | каля 40 тыс. забітымі. Сэрбы захапілі у палон 8600 чэлавек, 1500 раненых, 40 гармат, 17 гаубіць (адмена вялікіх гармат), 85 артылерных павозак, 36 пулемётоў, 12 яшчыкоў з рэвольварамі, 7 тыс. шрапнэлёў (куль), 3 тыс. коней і 600 валоў. Шкоды сэрбаў—8500 раненых і 1500 забітых.

### Чэрнагорска Аўстрыяцкая.

16 жніўня. У ваколіцах Будвы высадзіўся на бераг сільны аўстрыяцкі атрад, маючы сабе у помач артылерыю з ваенных аўстрыяцкіх параходоў. После нядоўгай заўзятай бітвы, чэрнагорцы разбілі аўстрыякоў, змушэных з вялікімі стратамі і ў поўным безпарадку вярнуцца на свае караблі.

### Француска-Нямецкая.

12 жніўня. Францускіе пазыціі паўдзённай часьці, дзе вядзецца бітва, былі атакованы немалымі нямецкімі сіламі. Атака адбіта. Непрыяцель атступіў па ўсей лініі.

13 жніўня. Агулам наступаньне французоў паміж Нансі і Вогезамі ідзе бойка. Паміма таго правае крыло змушэна было атступіць. У ваколіцы Сэндіэ Немцы мелі немалые страты. Знайдзена 1500 трупоў на невялікай мясьціне. У адной траншэі (акопе) цэлая воінская часьць была зністожана французамі. Пад Вавром не было ніякіх сур‘ёзных стычак. Абедзьве староны аддыхаюць после недаўных бітваў.

14 жніўня. У Вогезах французы ізноў перайшлі у прыступ і аткінулі немцоў. У ваколіцы Вогезаў і Нансі наступаньне французоў не перэрываецца пяты дзень. Страты немцоў вялікіе. Гэтак у адным мейсцы каля Нансі знайдзена 2500 забітых немцоў, а ў ваколіцы Бітрымон—4500 забітых

16 жніўня. На ўсім фронце нічога не зьмянілося. Наступаньне немцоў стрымліваецца з двух старон. За час петнаццацідзённых бітвоў страты нямецкіе вельмі вялікіе, гэтак 12 ы і 124 ы паўкі злучэны у адзін поўк.

17 жніўня. На цэлым француска-нямецкім тэатры вайны мала што змянілася. Бітвы адбываліся с пераменным шчасьцем. На правым крыле наступаюць французы, а на левым немцы у старану Ля-Фэр.

### Ангельска-Нямецкая.

Англічане ваююць у хаўрусе з

